# Пачуцці і вайна ў аповесці В. Быкава “Пакахай мяне, салдацік”

В. А. Бусел
БДПУ (Мінск)
Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.

**Анатацыя.** На матэрыяле аповесці В. Быкава “Пакахай мяне, салдацік” даследуецца спецыфіка раскрыцця тэмы кахання на вайне. Характарызуюцца вобразы галоўных герояў твора.

**Ключавыя словы:** В. Быкаў; тэма кахання; жанчына; вайна; аповесць.

Творчасць Васіля Быкава, аднаго з самых папулярных беларускіх майстроў слова, ужо даўно і надзейна заняла трывалае месца ў духоўным жыцці нашага народа, заслужана атрымала сусветнае прызнанне. Такая ўсенародная слава прыйшла да Быкава праз мужнае, па-мастацку вытанчанае, пакутніцкае адлюстраванне ваенных падзей. Васіль Быкаў, мабыць, як ніхто іншы ў савецкай літаратуры адлюстроўваў трагедыйнасць вайны. І якраз таму, што свядома ставіў перад сабой задачу пісаць праўду і толькі праўду, якой бы суровай, жорсткай, а часам і жахлівай яна ні была.

Свядома пашыраючы само паняцце гераічнага, Быкаў адлюстроўвае шматбаковасць штодзённага жыцця “маленькага чалавека”. У творах разам з паказам узвышанага гераізму, балючага трагізму, цяжару ад маральнага выбару знайшло адлюстраванне, напэўна, самае апетае “маленькімі людзьмі” пачуццё – каханне.

У напісных у розны час аповесцях “Альпійская балада”, “Пайсці і не вярнуцца”, “Пакахай мяне салдацік”, “Трэццяя ракета” выявілася няспынная моц кахання, кахання рознага, часам – узнёслага, стваральнага, часам – нізкага, руйнуючага. Безумоўны ўплыў гэтага пачуцця на лёсы людзей (і больш шырока – дзяржаў, народаў) стаў прадметам уважлівага мастацкага аналізу аўтара твораў.

Васіль Быкаў на працягу шматграннай творчасці вызначаўся непахіснасцю ў адстойванні сваіх перакананняў, той праўды, што ён спасцігаў на крывавых франтавых шляхах. Менавіта таму яго творчую спадчыну стэрэатыпна прынята лічыць гімнам мускуліннасці, а героі Быкава час ад часу паўстаюць у крытыцы паўбагамі, тытанамі, якія, амаль пазбаўленыя чалавечнасці, трываюць з апошніх сіл, імкнучыся абараніць эфемерныя ідэалы.

Няшмат хто ведае, але Быкаў па складзе душы быў чулы, вельмі далікатны чалавек, здольны з выключнай вастрынёй рэагаваць на людскія пакуты і беды. Ён рашуча кідаўся на дапамогу многім людзям, не думаючы пра нязручнасці і цяжкасці для сябе. Такая мяккасць, паэтычнасць характару зрабіла Васіля Быкава пісьменнікам, творчасць якога не пазбаўленая рамантычнай плыні. Але, напэўна, найбольшы аўтабіяграфізм і пачуццёвая афарбаванасць выявіліся ў аповесці “Пакахай мяне, салдацік”.

“Пакахай мяне, салдацік. Буду вернай жонкаю. А забудзеш – толькі разам з роднаю старонкаю... [1]. У гэтых легкадумных радках простай салдацкай песенькі выявілася ўся моц сардэчнай прыхільнасці, перажыванняў юнакоў, няхітрае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

памкненне кожнай жывой істоты – кахаць і быць каханым. Пісьменнік любуецца светлымі пачуццямі хлопца і дзяўчыны, цёплымі словамі абмалёўвае хараство іх узаемаадносінаў, дзе ён – мужны, яна – сціплая, жаноцкая. Майстра слова паказвае нясмелае маладое каханне, нетаропкае ў сваіх пачуццёвых праявах, поўнае цноты і чысціні. Ды якім яшэ мала быць гэта каханне, калі на вайну траплялі “волаты”, якія яшчэ ўчора танцавалі свой школьны вальс, магчыма, апошні ў жыцці?

Менавіта такім “ваяром” і з’яўляецца герой твора – Змітрок Барэйка. Прататыпам гэтага сціплага, але мужнага і рашучага хлопца, апаленага вайной і жахамі жыцця, з’яўляецца Васіль Быкаў. Менавіта праз вобраз юнака-салдата Быкаў паказвае цяжар вайны вачамі маладосці, калі абставіны здаюцца неверагоднымі, несправядлівымі, немагчымымі, калі хочацца жыць, кахаць, ствараць, але пачуццё доўгу прымушае руйнаваць, знішчаць, забіваць…

У гэтым творы пачуццё закаханасці паяднана з пачуццём зямляцкасці. Зямляцкасць у творы з’яўляецца моцным духоўным фактарам. Яна істотна паўплывала на збліжэнне галоўных герояў. За ўвесь час вайны Змітрок сустрэў усяго толькі некалькі беларусаў, і вось ўжо ў Аўстрыі, у апошнія дні вайны адбылася нечаканая сустрэча з землячкай Франяй.

З болем і агідай майстра слова дэманструе разбуральнае ўздзеянне вайны на далікатную жаночую псіхіку. Вайна калечыць, руйнуе жыццё, робіць няздольнымі на нармальнае існаванне, яна забірае ў іх нават саму магчымасць пазітыўнага развіцця лёсу. Жыццё Франі нібыта не можа разівацца па іншаму сцэнарыю, з самага пачатку твора яна, як матылёк, ляціць на святло з адзінай мэтай – сутыкнуцца са шклом.

Быкаў дасканала праводзіць тэму безабароннасці жанчыны на вайне. У сітуацыі агульнага безладдзя, безнадзейнасці, маладая прывабная жанчына была фактычна сам на сам пакінутая са сваёй бядой. Нахабныя заляцанні і зняважлівае стаўленне да дзяўчат паказваюцца ў творы ганебнай нормай тагачаснага жыцця. З прыкрасцю і абразай Франя ўспамінае “подзвігі” начальства: “Начальнікамі над намі былі хлопцы, а то й дзядзькі ў гадах ужо. Тыя нікуды не хадзілі, толькі за намі сачылі. Каб ні дай бог бязь іхнага ведама – нікуды. І любілі пакарыстацца дзяўчаткамі... Намесьнік камандзіра Кашэльнікаў бывала кажа: што ж такога – ля калодзежа жыць, ды вады не напіцца” [1].

Аднак нягледзячы на перыпетыі асабістага жыцця, якія прымусілі Франю вельмі рана спазнаць некаторыя негатыўныя дэталі дарослага свету, яна змагла зберагчы чысціню і цноту. Дзяўчына імкнецца да кахання, яна марыць адчуць цеплыню сапраўдных пачуццяў. Вельмі ўражвае сцэна спаткання галоўных герояў, дзе гарачыня хлопца, апантанага першым каханнем, разбіваецца аб сціпласць дзяўчыны, выхаванай у коле традыцыйных народных каштоўнасцяў.

Аднак Быкаў, маючы за плячыма найсуровейшы досвед жахлівых гадоў, які застаўся з ім навечна, у сваёй творчасці ідучы ад асабістага вопыту, не мог дазволіць лёсам Франі і Змітра скласціся ўдала – ён абрывае жыццё дзяўчыны, каб

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прымусіць хлопца перажыць невыносны боль, каб раз і назаўсёды замацаваць у свядомасці чытача думку аб разбуральнасці і недапушчальнасці вайны.

На мой погляд, менавіта ў гэтым творы найбольш яскрава выявілася грамадзянская пазіцыя аўтара – яркі, высокі прыклад служэння мастацкаму слову, народу, праўдзе і чалавечнасці. Дзіўна, але нават трызнячы над целам каханай, хлопец не адчувае прагі да помсты. Сама думка аб новым гвалце недапушчальная для яго, Зміцер нібыта прымірaецца з жорскімі ўмовамі вайны і прыносіць ёй дагарую сэрцу ахвяру. Ён хавае Франю, быццама закопваючы разам з ёй жахлівыя ўспаміны аб страшэнных падзеях, сведкам якіх ён быў чатыры гады.

Кажуць, што на вайне няма няверуючых. Аднак не толькі да Бога звярталіся ў малітвах салдаты і афіцэры, але і да дарагіх сэрцу жанчын. Звярталіся, прыгадваючы мінулае, звязваючы з імі будучыню, аб якой яны марылі, за якую змагаліся. Каханне надавала ім мужнасць і рашучасць у барацьбе з ворагам. Многія, сустрэўшы свае нечаканыя пачуцці, абудзіліся для гераізму і подзвігу.

Цяжка пераацаніць значэнне жанчыны на вайне як салдата, повара, прачкі, медработніка, але, мне здаецца, само існаванне жанчыны на вайне для байцоў было цудам. Таму што, часам, калі салдаты проста глядзелі на жанчыну, яны забываліся, што вакол вайна.

*Літаратура*

1. Быкаў, В. Пакахай мяне, салдацік / В. Быкаў [Электронны рэсур]. – Рэжым доступу: http://www.bykau.info/works/pakachaj.htm. – Дата доступу: 11.02.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ